# ДАБРАЧЫННАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ РОДУ РАДЗІВІЛАЎ ПА АКАЗАННЮ ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЛАМУ НАСЕЛЬНІЦТВУ І ВАЙСКОЎЦАМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914–1918 ГГ.)

**Я. А. Бодрыкаў**

*yaugen.bodrykau@yandex.by;*
*Навуковы кіраўнік – А. Я. Верамейчык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

Артыкул прысвечаны даследаванню дабрачыннай дзейнасці прадстаўнікоў роду Радзівілаў падчас Першай сусветнай вайны. Аналізуецца дзейнасць князя Альбрэхта Радзівіла і Марыі Магдалены Радзівіл у сферы сацыяльнай дапамогі пацярпеламу ад вайны насельніцтву і вайскоўцам на тэрыторыі беларускіх губерняў. Робіцца выснова аб характары і памерах дабрачыннай дапамогі прадстаўнікоў роду Радзівілаў у перыяд Першай сусветнай вайны.

***Ключавыя словы***: Радзівілы; Першая сусветная вайна; дабрачынная дзейнасць; бежанцы; сем'і мабілізаваных.

Першая сусветная вайна 1914–1918 гг. стала складаным перыядам для насельніцтва беларускіх губерняў. Мабілізацыя ў Рускую імператарскую армію закранула многія сем'і, не ўсе з якіх маглі атрымаць дастатковую фінансавую падтрымку з боку дзяржавы. Акрамя таго, праз тэрыторыю беларускіх губерняў за перыяд вайны прайшло больш мільёна бежанцаў, а ў 1915 г. баявыя дзеянні закранулі тэрыторыю Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў. Падзеі Першай сусветнай вайны аказвалі негатыўны ўплыў на матэрыяльны стан большай часткі насельніцтва беларускіх губерняў, у асаблівасці бежанцаў і сем'ям мабілізаваных вайскоўцаў. Ва ўмовах немагчымасці з боку дзяржавы пакрыць усе неабходныя расходы грамадскія дабрачынныя арганізацыі і багатыя прыватныя асобы Расійскай імперыі імкнуліся аказваць дадатковую дапамогу найбольш пацярпелым слаям насельніцтва. Сярод такіх ахвяравальнікаў можна адзначыць адразу некалькі прадстаўнікоў роду Радзівілаў, а менавіта перадапошняга ўласніка Нясвіжскага замка князя Антонія Альбрэхта Радзівіла і вядомую мецэнатку Марыю Магдалену Радзівіл.

Не гледзячы на значны інтарэс да роду Радзівілаў сярод беларускіх, польскіх і літоўскіх гісторыкаў, дабрачынная дзейнасць прадстаўнікоў роду ў гады Першай сусветнай вайны да нашага часу даследавана ў недастатковай ступені. Сярод прац айчынных гісторыкаў варта

адзначыць артыкулы А. Я. Верамейчык [2–4], прысвечаныя грамадска-палітычнай дзейнасці князя Альбрэхта Радзівіла і яго бліжэйшых сваякоў у першай палове XX ст. У артыкулах асноўная ўвага надаецца грамадскай і палітычнай дзейнасці, дабрачынная дзейнасць князя Альбрэхта Радзівіла закранаецца ўскосна. Мецэнацкая і дабрачынная дзейнасць княгіні Марыі Магдалены Радзівіл раскрываецца ў артыкуле даследчыцы беларускай літаратуры І. Э. Багдановіч [1]. Пры гэтым, комплексных прац па азначанай тэматыцы ў айчыннай гістарыяграфіі на дадзены момант не існуе.

У 1914 г. новым уласнікам Нясвіжскага замка стаў князь Альбрэхт Радзівіл, які, не гледзячы на цяжкае фінансавае становішча, амаль адразу ўключыўся ў дабрачынную дзейнасць. Разам са сваёй маці Марыяй Розай ён адкрыў лазарэт для параненых салдат Рускай імператарскай арміі [2, с. 82]. У хуткім часе і сам замак быў перабудаваны пад вайсковы шпіталь, які ўжо ў верасні 1914 г. афіцыйна быў падпарадкаваны Галоўнаму ўпраўленню Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа. Для забеспячэння рэгулярных паставак харчавання і шпіталізацыі параненых вайскоўцаў князь Альбрэхт Радзівіл за ўласныя сродкі наймаў чыгуначныя саставы [3, с. 11–12].

Шпіталь князя Альбрэхта Радзівіла ў Нясвіжы неаднаразова наведвалі прадстаўнікі ўлады і армейскага камандавання Расійскай імперыі. У прыватнасці, у шпіталі ў перыяд вайны былі Вярхоўны Галоўнакамандуючы Вялікі князь Мікалай Мікалаевіч і мінскі губернатар У.А. Друцкой-Сакалінскі. У эміграцыі былы чыноўнік напісаў і выдаў свае мемуары, у якіх узгадваў і гэты эпізод сваёй дзейнасці на чале Мінскай губерні. Пры гэтым, былы губернатар апісаў не стан медыцынскай службы і дагляду за параненымі, а ўласныя эстэтычныя адчуванні ад недахопу асвятлення і выгляду прыслугі [5, с. 160]. Акрамя таго, успаміны аб сваёй службе ў наваколлях Нясвіжа ў якасці санітара пакінуў і будучы вядомы рускі пісьменнік К. Г. Паўстоўскі [9, с. 424]. Не гледзячы на матэрыяльныя і тэхнічныя складанасці, дзейнасць супрацоўнікаў шпіталя неаднаразова адзначаліся вышэйшым кіраўніцтвам і нават урадам Расійскай імперыі. Шпіталь працягваў сваю ранейшую працу і пасля Лютаўскай рэвалюцыі [7, арк. 149], аднак ужо ў канцы 1917 г. быў нацыяналізаваны бальшавікамі. Толькі ў сакавіку 1918 г., пасля падпісання Брэсцкай мірнай дамовы, шпіталь быў канчаткова ліквідаваны [4, с. 59–63].

Акрамя аказання дапамогі параненым вайскоўцам князь Альбрэхт Радзівіл аказваў дапамогу і мірным жыхарам, пацярпелым ад ваенных падзей. Так у 1914 г. князь Альбрэхт Радзівіл заснаваў Нясвіжскі камітэт грамадскай дапамогі хрысціянскім сем’ям і асобам, якія маюць

патрэбу ў дапамозе з прычыны вайны. Адметнай асаблівасцю гэтай дабрачыннай арганізацыі было тое, што яна аказвала дапамогу толькі праваслаўным і каталіцкім вернікам з Нясвіжа і навакольных вёсак, а таксама бежанцам азначаных канфесій. Па стану на лістапад 1914 г. камітэт паспеў аказаць дапамогу 92 мясцовым жыхарам, сваякі якіх былі мабілізаваныя ў войска, на агульную суму ў 258 р. Дапамога выдавалася ў памеры ад 2 р. да 3 р. на чалавека. Сярод бежанцаў матэрыяльная дапамога найбольш актыўна выдавалася народным настаўнікам [6, арк. 22–23 адв.].

Яшчэ адной вядомай прадстаўніцай роду Радзівілаў, якая аказвала дапамогу пацярпелым ад ваенных падзей Першай сусветнай вайны, з'яўляецца Марыя Магдалена Радзівіл (дзявочае прозвішча – Завіша, у першым шлюбе Красінская). Да 1914 г. Марыя Магдалена Радзівіл ужо займалася мецэнацкай дзейнасцю і актыўна фінансавала беларускае кнігавыдавецтва, шпіталі і прытулкі для сірот. У пачатку Першай сусветнай вайны Марыя Магдалена Радзівіл ўвайшла ў склад Мінскага Гарадскога Камітэта грамадскай дапамогі сем'ям ніжніх чыноў запасу арміі і ратнікаў дзяржаўнага апалчэння, прызваных на дзейсную службу.

Першапачаткова Мінскі Гарадскі Камітэт збіраў грошы на дапамогу выключна праз ахвяраванні. Варта адзначыць, што ў зваротах да мясцовага насельніцтва з заклікам ахвяраваць грошы, Камітэт выкарыстоўваў не толькі рускую і польскую мовы, а таксама ідыш і беларускую мову. Можна меркаваць, што друк заклікаў на беларускай мове адбыўся пад уплывам Марыі Магдалены Радзівіл, вядомай сваёй прыхільнасцю да беларускай культуры і беларускага нацыянальнага руху. Акрамя таго, дзеячы Камітэта зрабілі абследаванне гарадскіх сем'яў мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння [8, с. 6–16].

У 1915 г. Марыя Магдалена Радзівіл стала ганаровым членам Цэнтральнага камітэта Літвы па справе дапамогі інвалідам вайны. Аднак, у дадзенай арганізацыі яе дзейнасць мела хутчэй прадстаўнічыя функцыі. Варта адзначыць, што Марыя Магдалена Радзівіл таксама пацярпела ад падзей вайны: у лістападзе 1914 г. на фронце загінуў яе муж – афіцэр Рускай імператарскай арміі Вацлаў Мікалай Радзівіл [1, с. 23]. Магчыма, гэтая асабістая страта таксама паўплывала на памкненні да працягу дабрачыннай дзейнасці на карысць сем'ям мабілізаваных вайскоўцаў.

У заключэнні трэба адзначыць, што Альбрэхт Радзівіл і Марыя Магдалена Радзівіл у перыяд Першай сусветнай вайны актыўна займаліся дабрачыннай дзейнасцю на карысць пацярпелых вайскоўцаў і мірнага насельніцтва. Дабрачынная дзейнасць прадстаўнікоў роду Радзівілаў у дадзены час мела арганізацыйны і фінансава-спонсарскі характар і абмяжоўвалася Мінскай губерняй, на тэрыторыі якой жылі

азначаныя дзеячы. Найбольш разнастайную дапамогу аказваў князь Альбрэхт Радзівіл, які разам са сваёй маці заснаваў вайсковы шпіталь і дабрачыннае таварыства для дапамогі бежанцам і сем'ям мабілізаваных, закранаючы фактычна ўсе слаі пацярпелага ад вайны насельніцтва. Ва ўмовах недахопу дзяржаўных сродкаў у сферы сацыяльнай дапамогі, дабрачынная дзейнасць прадстаўнікоў роду Радзівілаў мела важнае значэнне для функцыянавання комплекснай дзяржаўна-дабрачыннай сістэмы сацыяльнай падтрымкі насельніцтва на тэрыторыі Мінскай губерні.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Багдановіч І. Э.* Дзейнасць дзеля Бога і Айчыны: Магдалена Радзівіл і беларускае нацыянальнае Адраджэнне. Асветніца і мецэнатка: Да 150-годдзя Магдалены з Завішаў Радзівіл: матэрыялы круглага стала (Мінск, 15 снежня 2011 года). Мінск : «Кнігазбор», 2013. С. 20–30.
2. *Веремейчик А. Е.* Несвиж в исторических событиях 1915–1918 гг. // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 29–30 лістапада 2018 г.) / [рэдкалегія: А. Д. Кароль (старшыня) і інш.]. Мінск, 2018. С. 82–87.
3. *Веремейчик А. Е.* Несвиж и Радзивиллы в переломный период истории 1915–1918 гг.: свидетельства очевидцев // Научно-исследовательский институт истории, экономики и права. «Современная научная мысль». Москва, 2018. № 12, Ч. 2. С. 11–14.
4. *Веремейчик А. Е.* Общественно-политические связи Радзивиллов и светская жизнь Несвижского замка 1865–1939 гг. // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. 2007. № 17. С. 59–63.
5. *Друцкой-Соколинский В. А.* На службе Отечеству: Записки русского губернатора (1914–1918 гг.). Орел: РКФ «3 июля», РИГ «Невероят.мир», 1994. 405 с.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8576.
7. НГАБ. Ф. 694. Воп. 3. Спр. 165.
8. Отчет о деятельности Минского городского комитета общественной помощи семьям нижних чинов запаса армии и ратников государственного ополчения, призванных на действительную службу. Минск : Губернская типография, 1915. 31 с.
9. *Паустовский К. Г.* Далекие годы; Беспокойная юность: повести. Киев : Дніпро, 1987. 508, [2] с.